Басякова В., студ. гр. 214
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Гуд П.А.,
канд. гіст. навук, прафесар

# БЕЛАРУСКАЕ КУПАЛЛЕ

Сярод беларускіх народных свят, самае маляўнічае і паэтычнае- Купалле – дахрысціянскае свята летняга сонцастаяння, якое адзначалася ўсімі народамі Еўропы пад рознымі назвамі. З мэтай знішчэння паганскіх звычаяў духавенства прымеркавала да Купалля хрысціянскае свята Іаана Прадцечы,што і прывяло да ўтварэння назвы “Іван Купала”.Святкавалася ў ноч з 6 на 7 ліпеня (з 23 на 24 чэрвеня па ст.ст.) насычанае прыгожымі звычаямі свята Купалле, дахрысціянская сутнасць якога засталася амаль некранутай да нашых дзен. Назва свята ў наш час справядліва звязваецца з пакланеннем дайцу жыцця прыродзе-Сонцу, увасабленнем якога былі ачышчальныя купальскія вогнішчы. Адлюстроўваючы міфалагічныя аспекты светапогляду старажытнага чалавека,свята Купалле і сення атаясамліваецца ў свядомасці сучачнага чалавека з легендай пра папараць-кветку,у якой адлюстроўваліся адвечная вера чалавека ў шчасце,яго жаданне жыць ў гарманічным спалучэнні з прыродай, навакольным светам.

У народзе папараць лічылі Перуновай кветкай. Людзі надзялялі яе чарадзейнай сілай,верылі,што ўладальнік яе можа зрабіцца нябачным,адамкнуць і замкнуць любыя замкі,зразумець размовы звяроу і птушак,знайсці скарб,які з’яуляецца у выглядзе агеньчыкаў на кустах,кветках папараці. Сярод легендаў, паданняў, прымет і павер’яу купальскага свята, значная колькасць належыць вераванням аб нячыстай сіле. Існавала перакананне, што ў гэты дзень ведзьмы робяць заломы ў жыце, заводзяць людзей ў дрыгву, страшаць дзікім зверам; чараўніцы напойваюць кароў расой і тым адбіраюць у іх малако: выпраўляючыся на Лысую гару на шабаш ведзьмаў, яны забіраюць сялянскіх коней.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Імкнучыся абараніца ад нячыстай сілы, сяляне клалі ў вокны крапіву, каб ведзьма апяклася; убівалі касу, каб яна адрэзала сабе хвост.

Напярэдадні свята засеяныя палеткі абыходзіла працэсія, на чале якой ішоў мужчына, што трымаў у руках шэст з запаленым колам наверсе. У гэтым звычаі наглядна прасочваюцца ахоўная і апладняльная накіраванасць старажытных магічных дзеянняў, імкненне праз агонь, як адлюстраванне сонца ачысціць ад нячыстай сілы поле, павысіць яго ўраджайнасць.

Падрыхтоўчая частка свята пачыналася зборам кветак,раслін,траў. Гэтай справай займаліся дзяўчаты і жанчыны. Самым лепшым перыядам для збірання лекавых раслін на ўсёй тэрыторыі Беларусі, лічылі купальскія дні. Збіралі з васьмі да дзесяці гадзін раніцы, і з чатырох да пяці вечара ў сухое надвор'е. Сушілі так, каб прамыя сонечныя промні , раса і дождж не траплялі на сыравіну. Збіралі зелкі не толькі на лекі, але і на фарбы. Разам з дзяўчатамі у поле ішлі і старыя бабкі-знахаркі, таму што ведалі, якая зелка ад чаго дапамагае. Жывела вярталася з пашы ў гэты дзень, увянчаная кветкамі. Сабраныя купальскія кветкі ў далейшым з’яуляліся сродкам магічных варожбаў ахоўнай скіраванасці.

Важнейшай часткай Купалля з’яуляецца песня.Ею суправаджаецца ўсе асноўныя моманты абраду і гульні,тэатрылізаваныя дзеянні. Песні,быццам,адлюстроўваюць абрад,перадаюць яго сэнс.Галоўны вобраз купальскіх песень – Купалінка (Купалка). У іх паэтызуецца вобраз дзяўчыны,падкрэсліваюцца яе здольнасць да працы,умене наладзіць сямейнае жыцце,паказваюцца гасціннасць,душэўнасць,сціпласць і чысціня. Знайшлі ў купальскіх песнях свае адлюстраванне таксама сацыяльныя матывы пра няроўны шлюб, разнастайныя адносіны хлопцаў і дзяўчат.

Важным момантам падрыхтоўкі свята з’яўлялася мастацкае афармленне месца дзеяння і раскладванне вогнішча. Пляцоўку для будучага кастра спецыяльна падрыхтоўвалі. Касцер павінен быў быць вялікі,бачны здаля,таму што,згодна з павер’ямі,чым большую плошчу асвеціць яго полымя,тым болшь шчодра сонца будзе саграваць і асвятляць зямлю. Таму ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

славян здаўна існаваў звычай распальваць агонь на пагорках або на вяршынях гор. Вакол купальскага вогнішча вадзілі карагоды,ладзілі ігрышчы,здзяйсняліся ахоўна-ачышчальныя рытуалы,рабіліся захады дзеля засцярогі ад хвароб,заклінаўся ўраджай. Пляцоўка абавязкова павінна была быць ў выглядзе кола - Сонца – сімвала свята.Свята Купалле было святам варожбы - усе ў гэту ноч варажылі. Агульным напоем купальскай вячэры была - кулага.

У наш час старажытнае народнае свята летняга сонцстаяння,вызваліўшы ад рэлігійнай і язычніцкай асновы,з кожным годам заваеўвае ўсе большую папулярнасць , перетвараючыся у новае масавае свята,пабудаванае на народных традыцыях. На вялікі жаль, даволі часта прыходзіцца назіраць,што дзеянні каля кастра арганізуе нязначная колькасць “ражаных”, а большасць прысутных застаюцца пасіўнымі гледачамі. Гэта рэзка зніжае эфектыўнасць эмацыянальнага і выхаваўчага ўздзеяння свята. Адной з праблем сучаснага свята Купалля стала распрацоўка яго літаратурнай асновы. Справа ў тым,што аўтарскія сцэнарыі,якія рассылалі і рассылаюць у раены,вескі - Беларускі інстытут праблем культуры і абласныя навукова-метадычныя цэнтры,робяць добрую і карысную работу. З аднаго боку,яны знаемяць культработнікау з высокамастацкімі ўзормі сцэнарна-рэжысерскіх распрацовак свята,але з другога боку,многія дзеячы культуры на месцах,не крытычна ставячыся да праблемы адраджэння рэгіянальных традыцый, аўтаматычна ўвасабляюць прапанаваны сцэнрый цалкам,у выніку чаго два-тры сцэнарыя штогод “гуляюць” амаль па усей Беларусі. Гэта прыводзіць да штампу і аднастайнасці,пазбауляе свята тэрытарыяльных асаблівасцей,наносіць вялікую шкоду захаванню і развіццю мясцовых традыцый. Адсутнасць дастатковых фальклорна-этнаграфічных ведаў ў гэтай галіне прыводзіць да няправільнай творчай трактоўкі асобных фрагментаў свята. Няведанне сэнсу і значэння тога ці іншага абраднага дзеяння прыводзіць да таго,што святаператвараецца у падборку пад Купалле,няправільна арыентуе гледачоў на ўдзел у святочных дзеяннях. Таму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучэнне,асэнсаванне і ўкараненне ў сучаснае Купалле рэгіянальных і мясцовых традыцый яго правядзене на аснове мастацка-гістарычнай спадчыны беларусаў з'яуляецца актуальным і сацыяльна значным.Шматвякавы мастацкі вопыт народа пабудаваў Купалле у яскравай маляўнічай форме,напоўніў яго абрадавымі і гульнявымі дзеяннямі масавага характару. Свята з'яўлялася адным з любімых народных урачыстасцей таму,што дазваляла кожнаму далучыцца да яго арганізацыі і правядзення. Сення свята летняга сонцастаяння заваеўвае ўсе большую папулярнасць,праводзіцца ў большасці раенау Беларусі,ператвараючыся ў новае масавае свята,пабудаванае на народных традыцыях.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Гуд, П. А. Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей : вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных установ культуры і мастацтва / П. А. Гуд. – Выд. 2-е, стэр. – Мінск : [б. в.], 2006. – 134, [2] с. – Бібліягр.: с. 129-135.

2. Ліс А. С. Каляндарна – абрадавая творчасць беларусау / А. С. Ліс. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 188с.

3. Ліс А. С. Купальскія песні / П. А. Гуд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 208с.

Тавлай, Г. В. Белорусское купалье : обряд, песня / Г. В. Тавлай. – Минск : Наука и техника, 1986. – 172, [2] с. : ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ